Усю ноч бушавала возера. Стагналі хвалі...

З таго часу і назвалі людзі возера імем смелай дзяўчыны — Нарач.

1. Калі адбываліся падзеі, апісаныя ў легендзе? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
2. Як апісваецца ў творы Найрыта? Чым яна вылучалася сярод аднавяскоўцаў? Як склаўся лёс дзяўчыны? Які выбар яна зрабіла?
3. Ацаніце ўчынак Андрэя.
4. Адшукайце ў тэксце апісанні чароўнага возера ў пачатку і ў канцы легенды. Чым яны адрозніваюцца?
5. Якія падзеі ў легендзе маглі быць на самай справе, а якія — выдуманыя?
6. Знайдзіце і прачытайце легенду пра ўтварэнне ракі, возера, горада ці паселішча ў вашай мясцовасці. Раскажыце яе на ўроку.

## Пестунь

...Знайшлі аднойчы парабкі[1] на ўзлеску логавішча з трыма малымі ваўчанятамі. Толькі чапаць іх не сталі, бо ведалі, што раззлуюць дарослых ваўкоў — наклічуць бяду на скаціну. Ваўкі-бацькі счулі людзей, але логавішча не пакінулі. Мірнае суседства працягвалася, авечкі і гусі па-ранейшаму пасвіліся на выгане.

Аднак у хуткім часе самі ж парабкі і распудзілі драпежнікаў. Пачалі парабкі, ды яшчэ з сабакамі, ледзь не кожны дзень хадзіць да тых ваўчанят. Ваўкі нарэшце не

[1] *Па́рабак* — наёмны сельскагаспадарчы работнік у пана ці заможнага гаспадара.



Правообладатель Национальный институт образования



вытрымалі і аднойчы ноччу сышлі з двума ваўчанятамі невядома куды. Аднаго малога бацькі́ пакінулі, відаць, не змаглі, а мо і не паспелі забраць з сабой. Засталося малое ваўчанё ў старым логавішчы сіратой. Два дні, забіўшыся ў кут, моўчкі трывала, а на трэці, калі зусім прагаладалася, завыла на ўвесь лес. Сабраліся парабкі каля логавішча, не ведаючы, што рабіць. Забіць ваўчанё — бацькі́ абавязкова пачнуць помсціць. Забраць у вёску таксама небяспечна: бацькі́ зноў-такі ўзлуюцца. Так, пад галодны енк малога, і вярнуліся хлопцы дадому. А неўзабаве сціхла тое ваўчанё. Як толькі ўзышло сонца, пайшлі парабкі да логавішча, каб даведацца, што з малым. Спыніліся ў кустах і бачаць: на вытаптанай каля логавішча прагаліне ляжаць кавалкі перажаванага мяса, а побач, соладка пасапваючы, спіць ваўчанё. Спачатку падумалі, што гэта маці-ваўчыца не вытрымала і прынесла галоднаму дзіцяці паесці. Але раптам адзін з іх убачыў



Правообладатель Национальный институт образования

за густой ялінай вялізнага мацёрага[1] ваўка, што не зводзіў з людзей пільнага вока. Прыгледзеліся, ажно гэта зусім стары воўк, сівая поўсць касмыка́мі[2] тырчыць, вочы слязяцца... І зразумелі хлопцы, што прыцёгся сюды стары на покліч малога, пакарміў згаладалае, перапалоханае ваўчанё.

Усё лета ахоўваў ён падкідыша, карміў, пеставаў малога, а неўзабаве і забраў яго з сабой. А калі людзі, якія памяталі, як стары воўк пеставаў кінутае ваўчанё, пачалі будавацца непадалёку ад былога логавішча, то і вырашылі назваць вёску Пестунь...

1. Адкуль, паводле народнай легенды, пайшла назва вёскі Пестунь?
2. Ацаніце паводзіны парабкаў ля ваўчынага логавішча.
3. Паразважайце над учынкамі дарослых ваўкоў. На чыім баку вашы сімпатыі?
4. Каму пакінутае ў лесе ваўчанё абавязана выратаваннем?
5. Якi жыццёвы ўрок вы атрымалі, пазнаёміўшыся з гэтым творам?

## ЗАГАДКІ

### Літаратурная размінка

**1.** З якой мэтай беларускі народ складаў загадкі? Якое месца ў духоўным жыцці народа належала ім?

**2.** Успомніце з урокаў літаратурнага чытання некалькі загадак, якія вывучылі на памяць, загадайце іх сваім аднакласнікам.

**3.** Прыгадайце загадкі, якія гераіня казкі «Разумная дачка» дапамагала адгадаць свайму бацьку.

[1] *Мацёры* — тут: стары, вопытны.
[2] *Касмы́к* — скудлачаная пасма валасоў.



Правообладатель Национальный институт образования